Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Грыцкевіцкая сярэдняя школа”

# МАТУЛІНА СВЯТА

канспект гутаркі ў першай рознаўзроставай групе

Грышчанка Наталія Вікенцьеўна,
выхавальнік дашкольнай адукацыі
1 кваліфікацыйнай катэгорыі

аг. Грыцкевічы, 2022

Мэта: прывіваць дзецям любоў і павагу да маці; фарміраваць уменні ў дзяцей адкрыта і шчыра выказваць свае пачуцці да маці; развіваць творчыя здольнасці ў працэсе прадуктыўнай дзейнасці; выхоўваць клапатлівае, уважлівае стаўленне да маці, уменне цаніць яе клопат аб блізкіх.

Ход гутаркі

Выхавальнік: Рабяты, я прачытаю верш, а вы скажаце пра каго ён.

**Мама**

Мамачка мілая,
Лепшая самая.
Самая лепшая
Мама мая.
Як сонейка ў небе,
Усмешка твая.
Самая мілая
Мама мая. *Рыжсынкоў Данііл*

Правільна, пра маму. А якое хутка свята? (Дзень маці).

Малайцы! У кожнага з вас ёсць мама. Яна любіць вас, клапоціцца пра вас. Заўсёды знаходзіцца побач і гатовая ў любую хвіліну прыйсці да вас на дапамогу. А вы любіце сваіх мам? (Паўза). Ведаеце як іх завуць?

Гульня "Імя маёй мамы" - дзеці перадаюць па крузе сонейка і ў каго ў руках сонейка называюць імя сваёй мамы.

Добра! Ці ёсць у жывёл мамы? (так).

Гульня "Знайдзі маму для дзіцяняці" - дзеці выбіраюць сабе дзіцяня (карцінка) знаходзіць яго маму і ставяць дзве карцінкі разам на дошку.

Гульня " Чароўная скрыначка»

Дзеткі, вось паглядзіце, якая ў мяне ёсць чароўная скрыначка. Давайце напоўнім куфэрак ласкавымі словамі для мамы. Такім чынам, пачнем! Якая твая мама?

Калі дзеці не могуць назваць, выхавальнік задае навадныя пытанні.

Калі мама модна апранаецца, якая яна, (прыгожая.)

Калі мама усміхаецца, смяецца, якая яна? (вясёлая.)

Калі мама клапоціцца пра вас, якая яна? (клапатлівая.)

Калі мама займаецца гаспадаркай, робім шмат хатніх спраў, якая яна? (працавітая)

Калі мама абдымае вас, цалуе, шкадуе, яна якая? (ласкавая, добрая, мілая, пяшчотная.)

Малайцы! Вось колькі цудоўных слоў сабралі мы ў Чароўны куфэрак.

А пакуль мы яго закрыем, каб нашы словы не згубіліся і не забыліся.

У нашых мам шмат клопатаў. Мамы ўсе працуюць, ходзяць у магазін, прыбіраюць у кватэры, мыюць, гатуюць ежу. Матулі ўсе клапоцяцца аб сваіх дзецях. Стараюцца зрабіць усё, каб дзеткі раслі здаровымі, вялікімі і прыгожымі. Мамы вельмі стамляюцца, а дзеткі павінны дапамагаць матулі. Вы дапамагаеце сваёй маме?

Давайце дапаможам маме зварыць суп і зварыць кампот.

Гульня «Маміны памочнікі» - на адным крэсле каструля для супу, на іншым для кампоту. Дзеці па чарзе бяруць з кошыка фрукт ці гародніну і складаюць яго ў патрэбную каструлю.

Вось якія мы памочнікі, зварылі суп і кампот.

А цяпер павіншуем нашых мам са святам і скажам ёй як вы яе любіце.

Пальчыкавая гімнастыка “Маміна свята”

Матуля добрая, (паветраны пацалунак над далонню.)
Матуля любімая! (пацалунак над іншай далонню.)
Вельмі я яе люблю, (здзімае з далоні пацалунак.)
Пацалункі ёй дару! (здзімае пацалунак з другой далоні.)